

Download



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

❗**На два гады «хатняй хіміі» асудзілі жыхара Салігорска за абразлівы каментар на адрас начальніка мясцовага РУУС**

Паводле абвінавачвання, 15 красавіка 2021 года **Яўген Лубнеўскі**, будучы ў стане алкагольнага ап'янення, з дапамогай мабільнага тэлефона пакінуў каментар у сацыяльнай сетцы "ВКонтакте" пад артыкулам у дачыненні да намесніка начальніка Салігорскага УУС **Сяргея Салаўя** (у той момант). Пры гэтым ён наўмысна выкарыстаў непрыстойную, зневажальную, абразлівую лексіку, чым прынізіў гонар і годнасць міліцыянта ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў.

Яўген Лубнеўскі прызнаў віну цалкам. Суду растлумачыў, што Салавей - быў участковым, калі абвінавачаны быў школьнікам: міліцыянт паставіў на ўлік Лубнеўскага за дрэнныя паводзіны. Калі ў сацсетцы абвінавачаны ўбачыў публікацыю пра Салаўя, успомніў дзіцячыя крыўды, прачытаў пад постам каментары іншых карыстальнікаў і таксама вырашыў напісаць.

Пацярпелы ўдзельнічаў у працэсе па скайпе, але кабінет, у якім была даступная сувязь, не прадугледжваў месцаў для слухачоў. Якія менавіта былі прычыненыя маральныя пакуты Сергею Салаўю стала вядома толькі ўдзельнікам працэсу, і ён заявіў кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры **2000 рублёў**.

Падчас спрэчак бакоў пракурор **Дзмітрый Міхалковіч** прасіў **прызначыць абвінавачанаму пакаранне ў выглядзе 1 года і 6 месяцаў абмежавання волі з накіраваннем** у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу.

⚖️ 4 лістапада суддзя **Валерый Рабы** агучыў прысуд: прызнаць Яўгена Лубнеўскага вінаватым паводле арт. 369 КК і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе **абмежавання волі без накіравання** ў выпраўленчую ўстанову **тэрмінам на два гады**, **спагнаць з яго на карысць пацярпелага 2000 рублёў** кампенсацыі маральнай шкоды, а тэлефон абвінавачанага канфіскаваць у даход дзяржавы як сродак учынення злачынства.

t.me/viasna96/7926

4.6K viewsedited Nov 4, 2021 at 19:13

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.or
g/js/telegram-widget.js?
```

Copy